и стабильной социально-политической обстановки. Практика показывает, что в каждом государстве существуют своя специфика, инструментарий для реализации сценария цветной революции, однако везде наблюдается шаблонный характер действий деструктивных активистов. Безусловно, указанные выше рекомендации по пресечению ОВД подобных попыток не являются исчерпывающими и должны дополняться либо изменяться с учетом динамики развития событий, поскольку наши условные «партнеры» из западных спецслужб также делают «работу над ошибками». Только консолидация усилий всех заинтересованных органов, организаций, институтов гражданского общества позволит оказать эффективное информационное противодействие в рассматриваемом аспекте деятельности.

Полагаем, что имеющийся практический опыт МВД Республики Беларусь в информационном противодействии попытке совершения цветной революции является весьма значимым для правоохранителей России, Казахстана, Узбекистана, Азербайджана и других государств постсоветского пространства, а полученные наработки могут быть использованы в качестве серьезной основы для научных исследований по рассматриваемой проблематике.

**Список использованных источников**


1. Вердиханова, З. В. «Цветная революция» как политический феномен современности / З. В. Вердиханова // Вестн. Ун-та. – 2014. – № 5. – С. 200–204.
2. Гришин, О. Е. «Цветные революции»: экспорт на постсоветское пространство / О. Е. Гришин, Е. М. Самсонова // Проблемы постсовет. пространства. – 2016. – № 3. – С. 79–91.
3. Керимов, А. А. Цветная революция как угроза политической системе государства: проблемы определения / А. А. Керимов, Т. В. Вербицкая // Вопр. упр. – 2019. – № 2. – С. 6–15.
4. Манойло, А. В. О противодействии цветным революциям [Электронный ресурс] / А. В. Манойло // Междунар. отношения. – 2014. – № 3. – С. 332–363. – Режим доступа: https://nbpublish.com/library_read_article.php?id=12060. – Дата доступа: 19.08.2022.
5. Наумов, А. О. Роль неправительственных организаций в «цветных революциях» [Электронный ресурс] / А. О. Наумов // Гос. упр. – 2018. – № 71. – С. 207–224. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/rol-nepravitelstvennyh-organizatsiy-v-tsvetnyh-revolyutsiyah/viewer. – Дата доступа: 29.06.2022.
6. Наумов, А. О. «Цветные революции»: использование технологий «мягкой силы» для смены политических режимов в конце XX – начале XXI веков : автореф. дис. … д-ра ист. наук : 5.6.2 / А. О. Наумов ; ФГБОУ ВО «Рос. гос. гуманитар. ун-т». – М., 2022. – 42 с.
7. Пономарева, Е. Г. «Цветные революции»: природа, символы, технологии / Е. Г. Пономарева, Г. А. Рудов // Обозреватель-Observer. – 2012. – № 3. – С. 36–48.
8. Сорокин, А. А. «Цветная революция» как технология смены политической власти / А. А. Сорокин // Вес. БДПУ. – Серыя 2. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2014. – № 1. – С. 14–17.
9. Тлепцок, Р. А. «Цветные революции»: теоретический концепт и политическая практика / Р. А. Тлепцок // Вестн. Адыг. гос. ун-та. – 2019. – № 4. – С. 60–71.
10. Цветкова, Н. А. Дискурс «цветных революций» / Н. А. Цветкова // Постсовет. исслед. – 2019. – Т. 2, № 2. – С. 940–950.


Дата поступления в редакцию: 31.10.2022

УДК 343.98

***П. А. Капіца***, *начальнік вучэбна-метадычнага аддзела*
*Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь*
*e-mail: p.kapitsa@sledcom.by*

## КРЫМІНАЛІСТЫЧНЫЯ ХАРАКТАРЫСТЫКІ РАСКРАДАННЯЎ У СФЕРЫ РАСПРАЦОЎКІ І ЎДАСКАНАЛЕННЯ ПРАГРАМНАГА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ

*Апісаны крыміналістычныя характарыстыкі раскраданняў, якія ўчыняюцца пад выглядам распрацоўкі і ўдасканалення праграмнага забеспячэння. Прыводзіцца класіфікацыя крыміналістычных характарыстык злачынстваў гэтага віду. Для кожнай з характарыстык вызначаны асноўныя структурныя элементы.*

*Ключавыя словы: раскраданні, махлярствы, раскраданні шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі, расследаванне злачынстваў, крыміналістычная характарыстыка, праграмнае забеспячэнне*

***P. A. Kapitsa**, Head of the Educational and Methodological Department*
*of the Institute for Advanced Training and Retraining of the Investigative Committee of the Republic of Belarus*
*e-mail: p.kapitsa@sledcom.by*

**FORENSIC CHARACTERISTICS OF EMBEZZLEMENTS IN THE FIELD OF SOFTWARE DEVELOPMENT AND IMPROVEMENT**

*The publication describes the forensic characteristics of embezzlements, which are committed under the guise of software development and improvement. The classification of forensic characteristics of crimes of this kind is given. The basic structural elements are determined for each of the characteristics.*

*Keywords: embezzlements, frauds, embezzlements by abuse of authority, investigation of crimes, forensic characteristic, software*

На распрацоўку і ўдасканаленне праграмнага забеспячэння (РПЗ) у Беларусі выдаткоўваюцца значныя аб'ёмы грашовых сродкаў, у тым ліку бюджэтных. мі могуць завалодаць нядобра - сумленныя распрацоўшчыкі праграмнага забеспячэння і асобы, якія ім садзейнічаюць. У такім выпадку магчыма гаварыць аб раскраданнях. Гэтыя грамадска небяспечныя дзеянні ўвогуле можна падзяліць на махлярствы (арт. 209 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (КК)), раскраданні шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі (арт. 210 КК) і звязаныя з імі злачынствы супраць інтарэсаў службы.

Нядобрасумленныя распрацоўшчыкі камп'ютарных праграм, якія, атрымаўшы грашовыя сродкі, наўмысна няякасна выконваюць свае дагаворныя абавязкі або не выконваюць іх наогул. Такія злачынствы можна падзяліць на падвіды:

махлярствы, учыненыя ў адносінах да дзяржаўных органаў, у тым ліку рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, мясцовых выканаўчых і распараджальных органаў, арганізацый, падпарадкаваных Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, дзяржаўных юрыдычных асоб (у тым ліку ўстаноў адукацыі, аховы здароўя, культуры), таксама гаспадарчых таварыстваў, у адносінах да якіх Рэспубліка Беларусь або адміністратыўна-тэрытарыяльная адзінка, валодаючы акцыямі (долямі ў статутных фондах), можа вызначаць рашэнні, якія прымаюцца гэтымі гаспадарчымі таварыствамі (далей – дзяржаўныя органы і арганізацыі);

махлярствы, учыненыя ў адносінах да індывідуальных прадпрымальнікаў і арганізацый, якія не фінансуюцца з дзяржаўнага бюджэту і не з'яўляюцца ўласнасцю Рэспублікі Беларусь або яе адміністратыўна-тэрытарыяльных адзінак (далей – недзяржаўныя арганізацыі).

Узгаданыя вышэй раскраданні і злачынствы супраць інтарэсаў службы ўчыняюць службовыя асобы органаў і арганізацый, дзе праводзіцца інфарматызацыя. Яны з карыслівай або іншай зацікаўленасці садзейнічаюць нядобрасумленным выканаўцам. Падобныя злачынствы таксама дзеляцца на падвіды:

раскраданні, учыненыя ў арганізацыях, якія не фінансуюцца з дзяржаўнага бюджэту;

раскраданні, учыненыя ў дзяржаўных органах і арганізацыях.

Прыведзеная класіфікацыя абумоўлена парадкам выдаткавання бюджэтных грашовых сродкаў, неабходнасцю правядзення адмысловай працэдуры дзяржаўнай закупкі.

Небяспечнасць пералічаных злачынстваў выклікана не толькі памерамі раскраданняў, але і тым, што развіццё інфарматызацыі запавольваецца і правакуе тэхналагічнае адставанне Рэспублікі Беларусь ад іншых краін.

Для паспяховага процідзеяння гэтым злачынствам неабходна вылучыць іх крыміналістычна значныя прыкметы, якія дазволяць вызначыць сляды злачынстваў, а таксама прапанаваць рэкамендацыі па выяўленні, збіранні і ацэнцы доказаў. Такія прыкметы злачынстваў звычайна вылучаюць у выглядзе тэарэтычных інфармацыйных мадэляў. Як правіла, гэта крыміналістычныя характарыстыкі злачынстваў.

У айчыннай і расійскай навуковай літаратуры ў цяперашні час няма адназначнага меркавання наконт мэтазгоднасці распрацоўкі менавіта крыміналістычнай характарыстыкі злачынстваў. Многія навукоўцы скардзяцца на залішнюю тэарэтызаванасць і дагматычнасць гэтай мадэлі. Р. С. Белкін нават назваў крыміналістычную характарыстыку «фантомам крыміналістыкі» [2, с. 223].

Разам з тым тэарэтычная канструкцыя крыміналістычнай характарыстыкі злачынстваў уяўляе сабой зручную інфармацыйную мадэль, якую можна выкарыстоўваць як у падрыхтоўцы кваліфікаваных юрыдычных кадраў, так і пры распрацоўцы метадычных рэкамендацый па расследаванні злачынстваў. Пра гэта сведчыць не толькі наяўнасць значнага масіву агульнатэарэтычных даследаванняў, прысвечаных крыміналістычнай характарыстыцы злачынстваў (У. Ф. Ермаловіч [3], А. Н. Калеснічэнка [8], . . Рубцоў [10] і інш.), але і шырокае выкарыстанне гэтай катэгорыі пры распрацоўцы прыватных методык расследавання раскраданняў розных відаў. Так, крыміналістычную характарыстыку крадзяжоў, учыненых з пранікненнем у жытло, даў А. . Аляксандраў [1], крадзяжоў, рабункаў і разбойных нападаў – У. А. Жэрдзеў [4], вымаганняў, учыненых у складзе злачыннай групы – Т. В. Калеснікава [7], раскраданняў шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі ў бюджэтнай сферы – Ю. Ф. Камянецкі [5], раскраданняў сродкаў сотавай сувязі – А. У. Шабалін [11] і інш. Акрамя таго, альтэрнатыўныя крыміналістычнай характарыстыцы інфармацыйныя мадэлі злачынстваў не з'яўляюцца агульнапрынятымі і таксама маюць пэўныя недахопы.

Такім чынам, для гэтага даследавання мэтазгодна выкарыстаць катэгорыю крыміналістычнай характарыстыкі злачынстваў. Разам з тым не выключаецца і пабудаванне іншых інфармацыйных мадэляў злачынстваў зазначанага віду. Навукоўцамі прапанавана вялікая колькасць крыміналістычных характарыстык раскраданняў розных відаў. Аднак гэтыя даследаванні не змяшчаюць інфармацыйных мадэляў раскраданняў у сферы РПЗ.

Пералічанымі акалічнасцямі вызначаюцца актуальнасць і навізна гэтага даследавання.

У навуковай літаратуры сустракаецца шэраг азначэнняў крыміналістычнай характарыстыкі злачынстваў. Мэтазгодна найперш прывесці меркаванне беларускага крыміналіста У. Ф. Ермаловіча, які выканаў грунтоўнае агульнатэарэтычнае даследаванне гэтай навуковай катэгорыі: «крыміналістычная характарыстыка – сістэма (комплекс) крыміналістычна значнай інфармацыі аб злачынстве, якая распрацоўваецца і выкарыстоўваецца для павышэння эфектыўнасці выяўлення, раскрыцця, расследавання і папярэджання злачынстваў» [3, с. 278].

У гэтым азначэнні няма прывязкі да канкрэтных элементаў структуры крыміналістычнай характарыстыкі, яно не змяшчае ўказання на абгрунтаванасць следча-судовай практыкай і канкрэтныя мэты распрацоўкі крыміналістычнай характарыстыкі. Аднак, нягледзячы на пэўную абстрактнасць, прапанаваная дэфініцыя цалкам можа быць аднесена да крыміналістычных характарыстык злачынстваў розных відаў і груп, у тым ліку раскраданняў у сферы распрацоўкі і ўдасканалення праграмнага забеспячэння. Гэта абумоўлена тым, што абагуленасць прыведзенага азначэння не ставіць распрацоўшчыка прыватнай методыкі расследавання адразу ў абмежаваныя рамкі і тым самым прадухіляе катэгорыю крыміналістычнай характарыстыкі ад дагматычнасці.

Такім чынам, для азначэння паняццяў крыміналістычных характарыстык раскраданняў у сферы РПЗ магчыма цалкам абапірацца на прыведзеную дэфініцыю: крыміналістычная характарыстыка махлярстваў (раскраданняў шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі) у сферы РПЗ – сістэма крыміналістычна значнай інфармацыі аб махлярствах (раскраданнях шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі) у сферы РПЗ, якая распрацоўваецца і выкарыстоўваецца для павышэння эфектыўнасці іх выяўлення, раскрыцця, расследавання і папярэджання.

На нашу думку, асноўная мэта распрацоўкі прыватнай крыміналістычнай методыкі – стварыць такую інфармацыйную мадэль, якая, з аднаго боку, будзе найбольш поўна апісваць істотныя для працэсу даказвання прыкметы злачынства, з іншага боку – не будзе змяшчаць лішняй інфармацыі. У сувязі з гэтым пры канструяванні крыміналістычнай характарыстыкі сярод мноства элементаў, прапанаваных у навуковых даследаваннях, варта выбраць менавіта тыя, што ўласцівыя злачынству канкрэтнага віду. У структуру інфармацыйнай мадэлі таксама могуць быць уключаны крыміналістычна значныя прыкметы, якія раней не ўзгадваліся ў навуковых працах, аднак маюць важнае значэнне для расследавання менавіта такіх злачынстваў.

Паводле У. Ф. Ермаловіча, у якасці структурных элементаў крыміналістычнай характарыстыкі асобных відаў (груп) злачынстваў мэтазгодна разглядаць звесткі пра аб'ект і прадмет злачынства; спосаб учынення злачынства, спосаб утойвання злачынства, які знаходзіцца за межамі спосабу ўчынення злачынства, спосаб ухілення ад крымінальнай адказнасці і пакарання; мес-

ца і час учынення, утойвання злачынства і ўхілення злачынцы ад крымінальнай адказнасці і пакарання; прылады і сродкі, выкарыстаныя пры ўчыненні, утойванні злачынства і ўхіленні злачынцы ад крымінальнай адказнасці і пакарання; абстаноўку злачынства (перад учыненнем злачынства, у час і пасля яго); наступствы ўчынення і ўтойвання злачынства; асобу злачынцы, асобу суб'екта ўтойвання злачынства, які не з'яўляецца суб'ектам злачынства або яго асобнага эпізоду, асобу пацярпелага; матывы, намеры і мэты ўчынення, утойвання злачынства і ўхілення злачынцы ад крымінальнай адказнасці і пакарання; механізм злачынства; сляды злачынства і іх носьбітаў; сувязі паміж элементамі злачынства [3, с. 248–249].

Вылучаць усе пералічаныя элементы пры складанні крыміналістычнай характарыстыкі злачынства асобнага віду не заўсёды мэтазгодна. Для стварэння практыкаарыентаваных інфармацыйных мадэляў раскраданняў у сферы РПЗ неабходна вызначыць рысы, характэрныя для злачынстваў менавіта гэтага віду.

Прааналізаваўшы практыку Судовай калегіі Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь па справах інтэлектуальнай уласнасці аб разглядзе спрэчак, звязаных з невыкананнем абавязкаў па РПЗ [6] (следча-судовая практыка па крымінальных справах аб махлярствах, учыненых пад выглядам РПЗ, пакуль не напрацавана), а таксама шэраг вышэйузгаданых дысертацыйных даследаванняў, у якіх апісваюцца крыміналістычныя характарыстыкі раскраданняў падобных відаў, магчыма вылучыць асноўныя элементы крыміналістычных характарыстык раскраданняў шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі, якія ўчыняюцца ў сферы РПЗ. Такімі элементамі з'яўляюцца:

1. Суб'екты ўчынення злачынства (службовыя і іншыя асобы) і іх намеры.
2. Абстаноўка ўчынення злачынства.

Пад гэтым элементам, на нашу думку, варта разумець дэфініцыю, прыведзеную А. В. Маркавай для крыміналістычнай характарыстыкі эканамічных злачынстваў: сукупнасць умоў (фактараў) вытворчага, эканамічнага і сацыяльнага характару, у якіх дзейнічае (дзейнічаў) злачынца і якія ўплываюць на выбар ім спосабу ўчынення крымінальнага дзеяння, а таксама змяняюцца ў выніку яго ўчынення. Гэтыя ўмовы або ствараюць аб'ектыўную магчымасць для ўчынення злачынства, або, наадварот, ускладняюць нават робяць немагчымым яго ўчыненне [9, с. 151]. Для злачынстваў, віды якіх разглядаюцца, характэрна, што абстаноўка іх учынення дэтэрмінавана парадкам рэалізацыі праваадносін па РПЗ, вызначаным законам (праваадносіны ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з грамадзянскім заканадаўствам і (або) нормамі аб дзяржаўных закупках).

3. Спосаб учынення і ўтойвання злачынства – канкрэтны парадак дзеянняў або бяздзеяння суб'ектаў учынення злачынства.
4. Тыповыя сляды – змяненні ў матэрыяльным і нематэрыяльным асяроддзі, пакінутыя суб'ектамі злачынстваў пры рэалізацыі спосабу ўчынення раскраданняў.

Паміж усімі пералічанымі элементамі існуюць прамыя ўзаемасувязі. Пры гэтым ва ўзаемадзеянні элементы маюць нераўназначнае становішча. Так, суб'екты ўчынення раскраданняў, спосаб і тыповыя сляды непасрэдна не ўплываюць на вызначаны законам парадак рэалізацыі праваадносін па распрацоўцы і ўдасканаленні праграмнага забеспячэння. Разам з тым гэты элемент шмат у чым дэтэрмінуе спосаб, сляды злачыннай дзейнасці і склад саўдзельнікаў раскраданняў.

Прапануючы новыя крыміналістычныя характарыстыкі злачынстваў пэўных відаў, навукоўцы цалкам абгрунтавана абапіраюцца на крымінальна-прававую аснову. Гэта значыць, найперш увага звяртаецца на рысы, замацаваныя крымінальнай нормай. Для гэтага даследавання таксама мэтазгодна вылучыць і разгледзець асобна крыміналістычныя характарыстыкі махлярстваў і раскраданняў шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі ў сферы РПЗ. Для гэтых злачынстваў, як узгадана вышэй, варта вылучаць асаблівасці паводле спецыфікі пацярпелых, у адносінах да якіх учынены злачынствы, – дзяржаўных або недзяржаўных арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў.

Пра ўчыненне махлярства магчыма сцвярджаць, што нядобрасумленны распрацоўшчык праграмнага забеспячэння загадзя не збіраўся якасна выконваць свае абавязкі або выконваць іх наогул, уступіў у грамадзянска-прававыя адносіны з заказчыкам і завалодаў яго грашовымі сродкамі, пры гэтым службовыя асобы заказчыка і органа, упаўнаважанага праводзіць дзяржаўную закупку, не былі ўцягнутыя ў злачынную дзейнасць. Графічна структура крыміналістычнай характарыстыкі махлярства адлюстравана на мал. 1.




*Мал. 1.* Структура крыміналістычнай характарыстыкі махлярства

Суб’ектамі ўчынення злачынства перш за ўсіх з’яўляюцца нядобрасумленныя распрацоўшчыкі (індывідуальныя прадпрымальнікі і службовыя асобы юрыдычных асоб – выканаўцаў). Гэта асноўныя суб’екты. Пры групавым учыненні злачынства іх ролю можна ацэньваць не толькі як выканаўчую, але і як арганізатарскую.

Яны дзейнічаюць з прамым намерам на завалоданне грашовымі сродкамі заказчыка. Пры тым махляры загадзя не жадаюць выконваць абавязкі наогул або выконваць іх якасна. Гэта найважнейшая для кваліфікацыі асаблівасць суб’ектыўнага боку злачынства замацавана ў тым ліку ў абз. 3 ч. 12 пастановы Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 21 снежня 2001 г. № 15 «Аб прымяненні судамі крымінальнага заканадаўства па справах аб раскраданнях маёмасці» [5]. У сувязі са спецыфікай праваадносін раскрадальнікі адразу ўсведамляюць, што даказаць іх віну будзе складана, і мяркуюць, што адказнасць у горшым для іх выпадку можа быць абмежаваная толькі вынясеннем рашэння суда на карысць заказчыка па грамадзянскай справе.

Спецыфічнымі рысамі, якія ўплываюць на следавую карціну злачынства, для суб’ектаў такога віду з’яўляюцца:

наяўнасць службовых паўнамоцтваў (не з’яўляюцца істотнымі для кваліфікацыі махлярства, але без іх немагчыма заключаць дагаворы);

спецыяльныя веды ў праграмаванні (хоць часта і не на высокім узроўні);

службовыя і неслужбовыя сувязі з іншымі суб’ектамі злачынства і прадстаўнікамі заказчыка.

Да такога ж віду суб’ектаў адносяцца супрацоўнікі юрыдычных асоб – выканаўцаў (напрыклад, штатныя праграмісты). Пры іх наяўнасці яны з’яўляюцца саўдзельнікамі сваіх кіраўнікоў, бо ўсведамляючы факт невыканання або неналежнага выканання абавязкаў па дагаворы аб РПЗ і атрымліваючы матэрыяльную ўзнагароду, садзейнічаюць арганізатарам злачыннай дзейнасці.

Следаўтваральныя асаблівасці падобных суб’ектаў гэта:

спецыяльныя веды ў праграмаванні;

службовыя і неслужбовыя сувязі з іншымі суб’ектамі злачынства і прадстаўнікамі заказчыка.

Суб’ектамі ўчынення махлярства таксама могуць быць спецыялісты, якія прыцягваюцца выканаўцамі ў якасці экспертаў. Гэтыя асобы ўцягваюцца ў злачынную дзейнасць не з мэтай ўчынення махлярства, а для яго загадзя неабяцанага ўтойвання. Так, на стадыі судовага разбору па грамадзянскай справе нядобрасумленныя распрацоўшчыкі праграмнага забеспячэння могуць карыстацца паслугамі «незалежных» спецыялістаў у галіне Т . х намер – з карыслівай або іншай асабістай зацікаўленасці выказаць перад заказчыкам і судом наўмысна лжывае меркаванне (даць заключэнне) аб якаснасці выкананых работ.

Следаўтваральныя асаблівасці такіх суб’ектаў:

спецыяльныя веды ў праграмаванні (прынамсі, наяўнасць дакументаў, якія пра гэта сведчаць);

неслужбовыя сувязі з нядобрасумленнымі распрацоўшчыкамі праграмнага забеспячэння.

Акрамя таго, сярод суб’ектаў учынення махлярства фігуруюць супрацоўнікі арганізацыі-заказчыка (або органа, які ўдзельнічае ў арганізацыі дзяржаўных закупак у сферы інфарматы-

зацыі) – службовыя асобы. Яны могуць з'яўляцца памагатымі ва ўчыненні злачынства, напрыклад уплываць на прыняцце рашэння закупіць РПЗ менавіта ў нядобрасумленнага выканаўцы, перадаваць апошняму ўласныя Т -напрацоўкі заказчыка і інш. Намер – з карыслівай або іншай асабістай зацікаўленасці садзейнічаць раскрадальнікам.

Следаўтваральныя асаблівасці ўказаных суб'ектаў наступныя:

спецыяльныя веды ў праграмаванні;

неслужбовыя сувязі з іншымі суб'ектамі злачынства.

Абстаноўка ўчынення махлярства дэтэрмінавана парадкам рэалізацыі праваадносін па РПЗ, вызначаным законам.

Для махлярства ў адносінах да недзяржаўнай арганізацыі або індывідуальнага прадпрымальніка парадак ажыццяўлення праваадносін, пад выглядам якіх учыняецца раскраданне, вызначаецца грамадзянскім заканадаўствам, найперш артыкуламі Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь, якія рэгламентуюць парадак заключэння і рэалізацыі дагавору падраду і абавязальніцкія праваадносіны ўвогуле. Пра гэта сведчыць і практыка Судовай калегіі па справах інтэлектуальнай уласнасці Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь. Судовыя рашэнні ў асноўным змяшчаюць спасылкі на ўзгаданыя нормы.

Для махлярства ў дачыненні да дзяржаўнага органа або арганізацыі рэалізацыя праваадносін рэгламентавана масівам заканадаўства аб дзяржаўных закупках у сферы РПЗ.

Спосаб учынення і ўтойвання злачынства мае ў асноўным наступны парадак дзеянняў махляроў:

удзел нядобрасумленнага распрацоўшчыка ў магчымай конкурснай працэдуры (для дзяржаўных арганізацый – праходжанне ўсіх адмысловых этапаў працэдуры дзяржаўнай закупкі) або дамоўленасць заключыць дагавор з недзяржаўным заказчыкам іншым спосабам (напрыклад, па рэкамендацыі агульных знаёмых прадстаўнікоў заказчыка і выканаўцы, праз пошук выканаўцы ў сетцы нтэрнэт і інш .);

заключэнне дагавора;

атрыманне нядобрасумленнымі распрацоўшчыкамі грашовых сродкаў паводле ўмоў дагавора (усіх або часткі);

бяздзеянне або нядобрасумленнае выкананне абавязкаў – стварэнне замест якасных запатрабаваных заказчыкам камп'ютарных праграм такіх, якія не працуюць або працуюць няякасна, прадстаўленне замест новага прадукту нізкаякасных праграм на аснове ўласных напрацовак прадстаўнікоў заказчыка або агульнаўжывальнага софту (напрыклад, замест стварэння ўнікальнай базы дадзеных распрацоўка на аснове MS Access і інш.);

пісьмовыя і вусныя патрабаванні да заказчыка падпісаць акт прыёмкі выкананых работ, якія суправаджаюцца падманам з выкарыстаннем адмысловай тэрміналогіі ў сферы РПЗ;

пры адмове прыняць няякасную працу, звароце заказчыка ў суд – учыненне дзеянняў, накіраваных на ўтойванне злачынства, напрыклад прыцягненне ў якасці экспертаў асоб, якія наўмысна сцвярджаюць якаснасць камп'ютарных праграм, абгрунтаванне быццам бы аб'ектыўнай немагчымасці выканаць абавязкі і г. д.

Тыповымі матэрыяльнымі (у тым ліку віртуальнымі) слядамі махлярства, учыненанага пад выглядам РПЗ, з'яўляюцца:

дакументы – нарматыўныя прававыя і лакальныя акты; фінансава-гаспадарчая дакументацыя дзяржаўных органаў, дзяржаўных і недзяржаўных арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія з'яўляюцца заказчыкамі РПЗ, і іншых арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў (нядобрасумленных выканаўцаў, якія ўваходзяць з імі ў гаспадарча-прававыя адносіны, а таксама арганізацый, звязаных з распрацоўкай праграм інфарматызацыі і правядзеннем дзяржаўных закупак);

нібыта распрацаванае праграмнае забеспячэнне, іншыя матэрыялы – прэзентацыі, ілюстрацыі, выявы і інш., у тым ліку на матэрыяльных носьбітах (кампакт-дысках, жорсткіх дысках, флэш-картках і інш.);

электронная перапіска паміж прадстаўнікамі заказчыкаў і нядобрасумленных выканаўцаў, паміж суб'ектамі злачынства (на аддаленых серверах ці матэрыяльных носьбітах).

Тыповыя ідэальныя сляды махлярства гэтага віду замацоўваюцца ў сведчаннях падазраваных (узгаданыя суб'екты раскраданняў), сведкаў (прадстаўнікі арганізацый-заказчыкаў,

супрацоўнікі распрацоўшчыкаў, не ўцягнутыя ў злачынную дзейнасць), пацярпелых (заказчыкі – індывідуальныя прадпрымальнікі).

У адрозненне ад махлярстваў у сферы РПЗ, пры ўчыненні раскраданняў шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі ў злачынную дзейнасць уцягнуты службовыя асобы арганізацыі-заказчыка, дзяржаўнага органа, упаўнаважанага арганізоўваць і праводзіць дзяржаўныя закупкі. Графічна структура крыміналістычнай характарыстыкі раскраданняў шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі адлюстравана на мал. 2.




*Мал. 2.* Структура крыміналістычнай характарыстыкі раскраданняў шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі

Да суб'ектаў учынення дадзенага злачынства адносяцца службовыя асобы заказчыкаў і органаў, якія ўпаўнаважаны арганізоўваць і праводзіць дзяржаўныя закупкі ў сферы інфарматызацыі. Гэта асноўныя выканаўцы або нават арганізатары злачыннай дзейнасці.

Яны дзейнічаюць з прамым намерам – завалодаць грашовымі сродкамі арганізацый-заказчыкаў.

Спецыфічнымі рысамі, якія ўплываюць на следавую карціну злачынства, для суб'ектаў такога віду з'яўляюцца:

наяўнасць службовых паўнамоцтваў;

службовыя і неслужбовыя сувязі з падначаленымі, прадстаўнікамі распрацоўшчыка, службовымі асобамі органа, упаўнаважанага праводзіць дзяржаўную закупку, і інш.

Супрацоўнікі арганізацыі-заказчыка (органа, які ўдзельнічае ў арганізацыі дзяржаўных закупак у сферы інфарматызацыі) – неслужбовыя асобы, напрыклад уласныя Т -спецыялісты арганізацыі, юрысконсульты і інш. Намер прамы – з карыслівай або іншай асабістай зацікаўленасці садзейнічаць раскрадальнікам (павышэнне ў пасадзе, іншыя выгоды ад кіраўніцтва).

Следаўтваральнымі асаблівасцямі гэтых суб'ектаў з'яўляюцца:

спецыяльныя веды ў праграмаванні (калі гэта Т -спецыялісты);

службовыя і неслужбовыя сувязі са службовымі асобамі заказчыка – раскрадальнікамі.

Суб'ектамі такога віду раскраданняў могуць быць кіраўнікі і супрацоўнікі юрыдычных асоб – распрацоўшчыкаў праграмнага забеспячэння, а таксама іх магчымых субпадрадчыкаў.

Намер – наўмысна не выканаўшы дагаворныя абавязкі, завалодаць часткай грашовых сродкаў заказчыка па дамоўленасці з вышэйузгаданымі службовымі асобамі ці атрымаць ад іх іншыя матэрыяльныя або нематэрыяльныя даброты і перавагі.

Спецыфічнымі рысамі, якія ўплываюць на следавую карціну злачынства, для суб'ектаў з'яўляюцца:

наяўнасць службовых паўнамоцтваў;

спецыяльныя веды ў праграмаванні;

службовыя і неслужбовыя сувязі з кіраўнікамі і прадстаўнікамі заказчыка.

Сярод суб'ектаў раскраданняў шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі могуць быць спецыялісты ў сферы распрацоўкі праграмнага забеспячэння, якія прыцягваюцца ў якасці экспертаў. Характарыстыка гэтых суб'ектаў і іх намераў такая ж, як і пры ўчыненні махлярстваў. Але іх прыцягненне пры ўчыненні раскраданняў шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі значна больш факультатыўнае. Гэта звязана з тым, што раскрадальнікі – службовыя асобы заказчыкаў – зацікаўлены ў адсутнасці выяўлення факта раскрадання і звароту ў праваахоўныя органы (нават у суд у парадку грамадзянскага судаводства). Аднак такія суб'екты могуць прысутнічаць, калі раскраданне ўчынена службовай асобай органа, які ўплывае на прыняцце рашэння па дзяржаўнай закупцы, або службовай асобай заказчыка, а ў суд звяртаецца прадстаўнік заказчыка, не ўцягнуты ў супрацьпраўную дзейнасць.

Следаўтваральныя асаблівасці гэтых суб'ектаў такія ж, як і пры ўчыненні махлярстваў.

Абстаноўка ўчынення раскрадання, від якога разглядаецца, як і для махлярстваў, абумоўліваецца вызначаным законам парадкам рэалізацыі праваадносін па РПЗ.

Спосаб учынення і ўтойвання злачынства мае ў асноўным наступны парадак дзеянняў раскрадальнікаў:

падбор распрацоўшчыка праграмнага забеспячэння, згоднага на сайдзейнічанне ў рэалізацыі злачыннага намеру, і дамоўленасць з ім, для чаго могуць наўмысна ствараццa юрыдычныя асобы або рэгістравацца індывідуальныя прадпрымальнікі, якія потым выкарыстоўваюцца ў якасці падрадчыкаў і субпадрадчыкаў для вывядзення праз іх рахункі грашовых сродкаў;

правядзенне мерапрыемстваў па ўключэнні РПЗ для патрэб дзяржаўнага органа (арганізацыі) у праграму інфарматызацыі;

удзел арганізацыі-заказчыка ва ўсіх адмысловых этапах працэдуры дзяржаўнай закупкі або ўдзел у конкурснай працэдуры (калі гаворка ідзе аб прыватным заказчыку) ці наўпрост прыцягненне неабходнага распрацоўшчыка;

заключэнне дагавора;

атрыманне распрацоўшчыкамі (магчыма, субпадрадчыкамі) грашовых сродкаў паводле ўмоў дагавора (усіх або часткі);

завалоданне грашовымі сродкамі службовымі асобамі – раскрадальнікамі і (або) іншымі асобамі, на карысць якіх дзейнічалі раскрадальнікі (у тым ліку праз некалькі рахункаў распрацоўшчыкаў і падрадчыкаў);

бяздзеянне або нядобрасумленнае выкананне абавязкаў распрацоўшчыкам;

падпісанне акта прыёмкі выкананых работ, а калі сама службовая асоба – раскрадальнік і на гэта не ўпаўнаважана, то выкананне дзеянняў, накіраваных на прымус (шляхам падману, хабару, запалохвання і інш.) адпаведнай службовай асобы да падпісання; пры гэтым, калі прыёмка праводзіцца ў некалькі этапаў, то службовая асоба, якая падпісала першы акт, можа падвяргацца шантажу з боку раскрадальнікаў на падставе таго, што з падпісаннем першага акта, службовая асоба становіцца нібыта ўцягнутай у злачынную дзейнасць, таму лепш ёй і далей прымаць няякасныя работы;

учыненне дзеянняў, накіраваных на ўтойванне злачынства, пры адмове добрасумленнай службовай асобай заказчыка прыняць няякасную работу і звароце заказчыка ў праваахоўныя органы (у тым ліку грамадзянскі суд).

Тыповыя сляды раскраданняў шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі паводле відаў – такія ж, як і сляды махлярстваў. Разам з тым канкрэтныя сляды будуць адрозніваццa. Так, пры раскраданнях шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі, у адрозненне ад махлярстваў, тыповыя сляды пакіне перапіска паміж прадстаўнікамі заказчыкаў напярэдадні правядзення мерапрыемстваў па рэалізацыі грамадзянскіх праваадносін. Гэта значыць, што службовыя асобы заказчыкаў загадзя дамаўляюцца з патрэбнымі ім распрацоўшчыкамі праграмнага забеспячэння, што знаходзіць сваё адлюстраванне ў матэрыяльных і ідэальных слядах.

Падводзячы вынікі даследавання, выкладзенага ў гэтай публікацыі, неабходна адзначыць наступнае.

Крыміналістычная характарыстыка махлярстваў (раскраданняў шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі) у сферы РПЗ – сістэма крыміналістычна значнай інфармацыі аб махлярствах (раскраданнях шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі) у сферы РПЗ, якая

распрацоўваецца і выкарыстоўваецца для павышэння эфектыўнасці іх выяўлення, раскрыцця, расследавання і папярэджання.

Асноўнымі структурнымі элементамі крыміналістычных характарыстык махлярстваў (раскраданняў шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі) у сферы РПЗ з'яўляюцца: суб'екты ўчынення злачынства (службовыя і іншыя асобы) і іх намеры, абстаноўка ўчынення злачынства, вызначаная парадкам рэалізацыі праваадносін па РПЗ, спосаб учынення і ўтойвання злачынства, тыповыя сляды.

Структуры крыміналістычных характарыстык махлярстваў і раскраданняў шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі ў сферы РПЗ маюць пэўныя адрозненні, абумоўленыя перш за ўсё складам суб'ектаў і спосабам учынення злачынстваў.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Александров, А. И. Криминалистическая характеристика краж с проникновением в жилище и их расследование : автореф. дис. ... канд. юрид. наук : 12.00.09 / А. И. Александров ; Ленингр. гос. ун-т им. А. А. Жданова. – Л., 1985. – 19 с.
2. Белкин, Р. С. Криминалистика: проблемы сегодняшнего дня : Злободневные вопросы российской криминалистики / Р. С. Белкин. – М. : Норма, 2001. – 240 с.
3. Ермолович, В. Ф. Криминалистическая характеристика преступлений / В. Ф. Ермолович. – Минск : Амалфея. – 2013. – 304 с.
4. Жердев, В. А. Криминалистическая характеристика краж, грабежей и разбойных нападений: методика расследования и методы раскрытия групповых преступлений : автореф. дис. ... канд. юрид. наук : 12.00.09 / В. А. Жердев ; Сарат. гос. акад. права. – Саратов, 2001. – 22 с.
5. Каменецкий, Ю. Ф. Расследование хищений путем злоупотребления служебными полномочиями в бюджетной сфере : монография : в 2 ч. / Ю. Ф. Каменецкий, В. П. Шиенок. – Минск : СтройМедиаПроект, 2017. – Ч. 1 : Теоретические основы и информационное обеспечение. – 248 с.
6. Капіца, П. А. Аб выкарыстанні судовай практыкі па грамадзянскіх справах пры распрацоўцы крыміналістычнай методыкі расследавання раскраданняў у сферы інфарматызацыі дзяржаўных органаў і арганізацый / П. А. Капіца // Право.by. – 2020. – № 3. – С. 78–83.
7. Колесникова, Т. В. Криминалистическая характеристика преступных групп, совершающих вымогательство : автореф. дис. ... канд. юрид. наук : 12.00.09 / Т. В. Колесникова ; Сарат. юрид. ин-т МВД России. – Саратов, 2000. – 23 с.
8. Колесниченко, А. Н. Криминалистическая характеристика преступлений : учеб. пособие / А. Н. Колесниченко, В. Е. Коновалова. – Харьков : Юрид. ин-т, 1985. – 93 с.
9. Криминалистическая методика : учеб. пособие : в 2 ч. / М. П. Шруб [и др.] ; под общ. ред. М. П. Шруба. – Минск : Акад. МВД, 2018. – Ч. 2. – 343 с.
10. Рубцов, И. И. Криминалистическая характеристика преступлений как элемент частных методик расследования : дис. ... канд. юрид. наук : 12.00.09 / И. И. Рубцов. – СПб., 2001. – 225 л.
11. Шебалин, А. В. Расследование хищений средств сотовой связи : автореф. дис. ... канд. юрид. наук : 12.00.09 / А. В. Шебалин ; Сарат. гос. акад. права. – Томск, 2010. – 23 с.


Дата паступлення ў рэдакцыю: 17.05.2022

УДК 343.985.8 + 004:34(476)

***Д. Н. Лахтиков**, кандидат юридических наук, доцент, начальник кафедры информационного права факультета криминальной милиции*
*Академии Министерства внутренних дел Республики Беларусь*
*e-mail: it@amia.by*

## ПРЕСТУПЛЕНИЯ, СОВЕРШАЕМЫЕ С ИСПОЛЬЗОВАНИЕМ ИНФОРМАЦИОННО-КОММУНИКАЦИОННЫХ ТЕХНОЛОГИЙ, КАК УГРОЗА НАЦИОНАЛЬНОЙ БЕЗОПАСНОСТИ В ИНФОРМАЦИОННОЙ СФЕРЕ

*Анализируются проблемные аспекты, связанные с трансформацией преступности в современных условиях. Акцентировано внимание на том, что достаточно остро стоят вопросы обеспечения нацио-*